УДК 808.26-316.4(043.3)

Д.А. ЛАЎШУК

ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ СУФІКСАЛЬНАГА І СУФІКСАЛЬНА-СКЛАДАНАГА СПОСАБАЎ УТВАРЭННЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ТЭРМІНАЎ

У наш час імклівага і бесперапыннага развіцця навукі і тэхнікі пастаянна ўзнікаюць новыя паняцці і рэаліі, што патрабуюць для сябе адпаведных назваў. Тэрміналогія – неад'емная частка лексічнай сістэмы мовы, таму арыентуецца ў сваім развіцці на асноўныя законы функцыянавання агульналітаратурнай мовы, у тым ліку ў галіне тэрмінаўтварэння. Практыка ўзнікнення тэрмінаў пераконвае, што навуковыя найменні ўтвараюцца тымі ж асноўнымі спосабамі, што і словы неспецыяльнай лексікі. Агульнавядома, што асноўным паняццем словаўтварэння з'яўляецца словаўтваральны тып. Пад словаўтваральным тыпам мы будзем разумець схему пабудовы вытворных слоў, якія, па-першае, належаць да адной часціны мовы, а па-другое, фармальна і семантычна тоесныя словаўтваральным фармантам. Зыходзячы з прынятага азначэння, паспрабуем вызначыць найбольш прадукцыйныя словаўтваральныя тыпы сучасных сельскагаспадарчых тэрмінаў, утвораных суфіксальным і суфіксальна-складаным спосабам.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Суфіксальнае тэрмінаўтварэнне

Суфіксацыя вельмі шырока выкарыстоўваецца ў працэсе тэрмінатворчасці. Аналіз фактычнага матэрыялу дазволіў выявіць наступныя словаўтваральныя тыпы тэрмінаў, утвораных пры дапамозе суфіксацыі:

1) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-нн-** для называння розных адцягненых паняццяў і працэсаў сельскагаспадарчай галіны вытворчасці: *адкормліваць – адкормліванне, акучваць – акучванне, банітаваць – банітаванне, выпойваць – выпойванне, гадаваць – гадаванне, завядаць – завяданне, пераворваць – пераворванне, сіласаваць – сіласаванне, стагаваць – стагаванне, ускопваць – ускопванне* і мн. інш.;

2) адпрыметнікавыя тэрміны з суфіксам **-асць-** са значэннем ступені якасці, а таксама са значэннем колькаснага адцення: *агрэгатны – агрэгатнасць (глебы), выдаены – выдаенасць, зольны – зольнасць, лабаты – лабатасць, малочны – малочнасць, спелы – спеласць, пародны – пароднасць, пладавіты – пладавітасць, супаросны – супароснасць, укормлены – укормленасць, шчыльны – шчыльнасць (пасадкі)* і мн. інш.;

3) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-енн- (-энн-)** са значэннем апрадмечанага дзеяння: *аднаўляць – аднаўленне (статку), варушыць – варушэнне, вяршыць – вяршэнне, даіць – даенне, здрабняць – здрабненне, карміць – кармленне, лушчыць – лушчэнне, паіць – паенне, узнаўляць – узнаўленне* і інш.;

4) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-лк-** са значэннем назвы розных прылад, механізмаў, прыстасаванняў для выканання дзеяння, названага ўтваральным словам: *абганяць – абганялка, варушыць – варушылка, драбіць – драбілка, мяшаць – мяшалка, паіць – паілка, сеяць – сеялка, шпурляць – шпурлялка* і інш.;

5) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-льнік-** са значэннем назвы розных сельскагаспадарчых прыстасаванняў для апрацоўкі глебы, раслін, кармоў: *апырскваць – апырсквальнік, здрабняць – здрабняльнік, кратаваць – кратавальнік, лушчыць – лушчыльнік, раскідваць – раскідвальнік* і інш.;

6) адназоўнікавыя тэрміны з суфіксам **-ан- (-ян-)** для абазначэння назваў маладых істот сельскагаспадарчай птушкі: *гусь – гусяня, індык – індычаня, качка – качаня, кура – кураня;*

7) адпрыметнікавыя ўтварэнні з суфіксам **-ішч- (-ышч-)** для абазначэння сельскагаспадарчых тэрмінаў з прасторавым значэннем: *аўсянае поле – аўсянішча, бульбяное поле – бульбянішча, гарохавае поле – гарохавішча, жытняе поле – жытнішча* і інш. Такія тэрміны суадносяцца са словазлучэннямі "назоўнік + адносны прыметнік" і абазначаюць месца, якое характарызуецца адпаведнай прыметай.

8) адпрыметнікавыя тэрміны з суфіксам **-іц** для намінацыі зоатэхнічных паняццяў: *малочная карова – малочніца, ялавая карова – ялавіца;* хвароб свойскай жывёлы: *жалезны – жалезніца, накосны – накосніца*; шкоднікаў сельскагаспадарчых культур: *начны – начніца, шашачны – шашачніца.*

9) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-льшчык-** для абазначэння асоб – выканаўцаў дзеяння, названага ўтваральным словам: *арфаваць – арфавальшчык, баранаваць – баранавальшчык, капніць – капнільшчык, сціртаваць – сціртавальшчык, церабіць – церабільшчык* і інш.;

10) адпрыметнікавыя тэрміны з суфіксам **-ін-** для абазначэння зборнага паняцця: *азімы – азіміна, зялёны – зеляніна, садовы – садавіна, яравы – яравіна* і інш.;

11) адназоўнікавыя тэрміны з суфіксам **-яцін- (-ін-)** са значэннем "мяса свойскай жывёліны ці птушкі": *гусь – гусяціна, куры – кураціна, парасяты – парасяціна, свінні – свініна, цяляты – цяляціна* і інш.;

12) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-к-** са значэннем адцягненай працэсуальнай прыметы ці выніку адпаведнага дзеяння: *абразаць – абрэзка, даіць – дойка, ліняць – лінька, насіць – ношка* і інш.;

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

13) адназоўнікавыя тэрміны з суфіксам **-атар- (-тар-)** са значэннем назвы асоб па сферы дзейнасці: *апрабацыя – апрабатар, меліярацыя – меліяратар, механізацыя – механізатар, хімізацыя – хімізатар* ; прыбораў ці прылад для ажыццяўлення дзеяння, названага ўтваральным словам: *грануляцыя – гранулятар, культывацыя – культыватар, пульверызацыя – пульверызатар, фумігацыя – фумігатар* і інш.;

14) адпрыметнікавыя тэрміны з суфіксам **-ец- (-эц-)** для абазначэння паняццяў паводле характэрнай якасці: *гнілы – гнілец* (пчал.), *доўгі – даўгунец, казіны – казінец* (вет.), *сыры – сырэц*;

15) тэрміны, утвораныя ад аддзеяслоўных прыметнікаў пры дапамозе суфікса **-ец-** для абазначэння прадмета паводле працэсуальнай прыметы: *саджаць – саджаны – саджанец, сеяць – сеяны – сеянец;*

16) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-ец-** для абазначэння асобы – выканаўцы дзеяння, названага ўтваральным словам: *грабсці – грабец, жаць – жнуць – жнец, касіць – касец;*

17) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-б-** для абазначэння адцягненай працэсуальнай прыметы: *касіць – касьба, малаціць – малацьба, сеяць – сяўба;*

18) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-нік-** са значэннем прылады, прыстасавання для ажыццяўлення дзеяння, названага ўтваральным словам: *акучыць – акучнік, запарыць – запарнік, паглыбіць – паглыбнік;*

19) адназоўнікавыя тэрміны і тэрміны, утвораныя ад субстантыўных прыметнікаў пры дапамозе суфікса **-ізацы- (-ызацы-)** для называння адцягненых працэсаў: *азімыя – азімізацыя, амоній – аманізацыя, карамель – карамелізацыя, клейстэр – клейстэрызацыя, яравыя – яравізацыя* і інш.;

20) адназоўнікавыя тэрміны з суфіксам **-атнік- (-ятнік-)** для абазначэння памяшкання, гадавальніка для жывёлы: *гусь – гусятнік, кура – куратнік, трус – трусятнік;*

21) адназоўнікавыя тэрміны з суфіксам **-нік-**, што абазначаюць сукупнасць сцяблоў раслін: *бурак – бурачнік, гарбуз – гарбузнік;*

22) адназоўнікавыя тэрміны з суфіксам **-ар- (-яр-)** са значэннем назвы асобы паводле аб'екта яе дзейнасці: *пчала – пчаляр, свіння – свінар;*

23) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-ак-** для абазначэння аб'екта дзеяння, названага ўтваральным словам: *адводзіць – адводак, адкормліваць – адкормак, выводзіць – вывадак, выбіраць – выбарак* і інш.;

24) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-шчык-** для абазначэння асобы паводле дзеяння, названага ўтваральным словам: *бракаваць – бракоўшчык, даіць – дойшчык, банітаваць – банітыроўшчык, нарыхтоўваць – нарыхтоўшчык.* Некаторыя тэрміны данага словаўтваральнага тыпу сумяшчаюць значэнне асобы і прадмета: *букецірваць – букецірoўшчык, брыкетаваць – брыкетыроўшчык, засыпваць – засыпшчык, падбіраць – падборшчык;*

25) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-арн-** для абазначэння механізма паводле выконваемага ім дзеяння: *малаціць – малатарня, секчы – сячкарня, сеяць – сявярня;*

26) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-ів- (-ыв-)** для абазначэння апрадмечанага дзеяння, а таксама выніку ці аб'екта дзеяння: *араць – ворыва, жнуць – жніво, зябліць – зяблівa, палоць – поліва;*

27) адпрыметнікавыя тэрміны з суфіксам **-ів-** для абазначэння рэчыва паводле адпаведнай прыметы: *зялёны – зяленіва, маладое малако – малодзіва;*

28) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-ыш-** для называння жывёл са значэннем выніку дзеяння, названага ўтваральным словам: *адняць – ад'ёмыш, выкарміць – выкармыш;*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

29) адназоўнікавыя тэрміны з суфіксам **-нік-** для абазначэння памяшкання для жывёлы: *жарабяты – жарабятнік, карова – кароўнік, пчала – пчальнік;*

30) аддзеяслоўныя тэрміны з суфіксам **-к-** са значэннем адцягненай працэсуальнай прыметы: *дажынаць – дажынкі, дакошваць – дакоскі, дамалочваць – дамалоткі, засяваць – засеўкі;* са значэннем "прадмет – носьбіт працэсуальнай прыметы": *аграбаць – агрэбкі, ападаць – ападкі, недажынаць – недажынкі.*

Для некаторых сельскагаспадарчых тэрмінаў характэрна наяўнасць суфіксаў памяншальнасці. Большасць падобных найменняў фармальна-семантычна суадносяцца з утваральнымі словамі ў межах сельскагаспадарчай тэрміналогіі: *баразна – баразёнка, бык – бычок, галава – галоўка, гаршчок – гаршчочак, граблі – грабелькі, грэбень – грабеньчык, града – градка, залоза – залозка.* Іншыя суадносяцца са словамі агульналітаратурнай мовы: *бародка, блошка, вулачка, вяночак, горка, жабка.* Такія тэрміны з пункту погляду іх семантычнай суаднесенасці з утваральнымі словамі нетоесныя.

Суфіксальна-складанае тэрмінаўтварэнне

Вялікую групу сярод суфіксальна-складаных найменняў у сельскагаспадарчай тэрміналогіі ўтвараюць складанні, дзе ў якасці апорнага кампанента выступае аснова дзеяслова. Сярод іх найбольшай прадукцыйнасцю вызначаюцца наступныя словаўтваральныя тыпы:

1) тэрміны з суфіксам **-нік-** для абазначэння розных адзінак сельскагаспадарчай тэхнікі: *буракапад'ёмнік, вадазборнік, глебапаглыбнік, ільноадборнік, многалямешнік;*

2) тэрміны з суфіксам **-льнік-** са значэннем асобы ці прылады, што прызначаныя для выканання дзеяння, названага апорнай асновай і канкрэтызаванага першай асновай: *буртаўкрывальнік, гноераскідальнік, дзёрназнімальнік, зернеўвільгатняльнік, кормаздрабняльнік, паветранагравальнік, саломаскладальнік;*

3) тэрміны з суфіксам **-шчык- (-чык-)** для абазначэння асобы ці прылады, што ўтварае дзеянне, названае асновай дзеяслова і канкрэтызаванае першай асновай: *бацвіннепагрузчык, бульбападборшчык, буртаўкладчык, збожжанарыхтоўшчык, кармадатчык, кормазагрузчык, сенаразгрузчык;*

4) тэрміны з суфіксам **-нн- (-енн-)** для абазначэння дзеяння або працэсу, названага дзеясловам і канкрэтызаванага першай асновай: *глебастамленне, гноевыдаленне, кормаздабыванне, макухадрабленне, сортаабнаўленне, тлушчаназапашванне, травасеянне;*

5) тэрміны з суфіксам **-к-** са значэннем прылады для выканання дзеяння, названага асновай дзеяслова: *бульбацёрка, сіласарэзка;* працэсу: *буракаўборка, медагонка;* свойскай жывёлы: *маладойка, першацёлка;*

6) тэрміны з суфіксам **-лк-** са значэннем прылады, прызначанай для выканання дзеяння, названага асновай дзеяслова і канкрэтызаванай асновай назоўніка: *бульбакапалка, зернедрабілка, кормамяшалка, кукурузасаджалка, самапаілка, сенасушылка, снопавязалка;*

7) тэрміны з суфіксам **-ств-** для абазначэння розных галін сельскай гаспадаркі: *бульбаводства, лугаводства, насенняводства, пладаводства, расліна-водства;*

8) тэрміны з суфіксам **-л-** для абазначэння сельскагаспадарчых галін вытворчасці: *гусегадоўля, жывёлагадоўля, індычкагадоўля, свінагадоўля;*

Дэрываты з суфіксам **-цель-** неўласцівыя беларускай мове, але часам у спецыяльных даведніках можна сустрэць суфіксальна-складаныя ўтварэнні тыпу *бацвіннеаддзяліцель, глыбокарыхліцель* для абазначэння прылады, механізма, прызначанага для выканання дзеяння, названага апорнай асновай. Зразумела,

Могилевский государственный университет имени А.А.Кулешова

што больш натуральнымі ў дадзеным выпадку былі б дэрываты *бацвіннеаддзяляльнік* і *глыбокарыхлільнік*.

Складанні з асновай назоўніка ў якасці апорнага кампанента малапрадукцыйныя ў сельскагаспадарчай тэрміналогіі.

Такім чынам, аналіз фактычнага матэрыялу дазваляе канстатаваць высокую ступень прадукцыйнасці суфіксальнага і суфіксальна-складанага спосабаў утварэння сельскагаспадарчых тэрмінаў. Асабліва значная ў колькасных адносінах група аб'ядноўвае словаўтваральныя тыпы з суфіксамі -нн-, - енн- (-энн-), -асць-, -льнік-, -лк-.

SUMMARY

This article deals with the analysis of the morphologically formed byelorussian agricultural terms. Productive word-building types of the agricultural terms are determined.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова